Olimpiada Języka Białoruskiego – XXVII edycja
Zawody II stopnia (okręgowe)
Hajnówka, 26 lutego 2021 roku

## I. Дзеясловы ў дужках запішы ў асабовых формах цяперашняга часу (10 пунктаў).

**Заяц варыць піва**

Туман (1)___________ (*плыць*) з нізіны сівы
Над івай голай і пустой.
"Глядзіце, заяц варыць піва", –
(2)_____________ (*жартаваць*) людзі між сабой.
А я відушчым (3)____________ (*бачыць*) зрокам,
Як ён прысеў каля агню,
Трыгубы, шэры, касавокі,
І піва варыць з ячмяню.
Яліна іскрамі (4)_____________ (*страляць*),
А ён прыладзіў кацялок
І трэскай зварыва (5)_____________ (*мяшаць*),
(6)___________ (*каштаваць*), (7)___________ (*сплёўваць*) набок.
І піва заяц зварыць густа,
А на закуску – бурачок,
Трава, заечая капуста,
Галін асінавых пучок.
З зайчыхай (8)____________ (*выпіць*) па маленькай
І дзеткам трошкі (9)____________ (*паднесці*),
Пужлівым галаском таненькім
"Цвіцела морква" (10)____________ (*завесці*).
Пабачыш – не гані з абсады,
Дай хоць на гэты дзень спакой,
Павінна ж быць і ў зайца радасць
Перад халоднаю зімой.

У. Караткевіч, *Заяц варыць піва* [у:] У. Караткевіч, *Збор твораў у дваццаці пяці тамах*, т. 1, Мінск 2012, с. 70.

## II. Словы ў дужках замяні антонімамі, антонімы запішы ў адпаведнай граматычнай форме (10 пунктаў).

Думаць (*ненавіджу*) ……………………………… я увечары ў змроку,
Свет апране калі (*белы*) ……………………………… строі,
Зорка глядзіць у аконца (*вялікі*) ………………………………, –
О, тады мыслі ўзлятаюць (*нізка*) ………………………………!

Мары душу апаноўваюць роем
Аб маёй долі, чарнейшай ад змроку.
Хоць сваё сэрца нячуласцю ўзброю,
(*Рэдка*) ……………………………… сляза набяжыць мне на вока.

Мару й чакаю чагосьці мо (*меней*) ……………………………?
Сам (*спытацца*) …………………………… я на гэта павінен...
(*Горшае*) ……………………………, здаецца, нейкае долі.

(*Гора*) …………………………… мяне калі ж не адкіне,
Як жа пазбудуся (*весялосць*) …………………………… і болю?
Хіба ў магіле - ў глухой дамавіне?..

Янка Купала, *У змроку*

## III. Устаў *е* або *я* згодна з сучаснай арфаграфічнай нормай (10 пунктаў).

ЯНКА. А што ж ён, па-вашаму, павінен рабіць у гэтае чыноўніцкае безрабоцце?

ГАНУЛЯ. Што? Хоць бы ўзяў, як іншыя, ды падвучыўся боты шыць або хоць латаць. Ну латаў бы, і капейка жывая была б у хац__ **(1)**, а так... *(Махнула рукамі.)*

ЯНКА. Трудна такому далікатнаму панічу за гэтакую чорную работу ўзяцца.

ГАНУЛЯ. Які там ён далікатны! Я сама з ягоным бацькам — людзі в__сковыя **(2)**. Мой н__божчык **(3)** гаспадар жыў пры бацькох на мал__нькім **(4)** надзеле. Адзін яшчэ сяк-так мясціўся ў сям'і, а як жаніўся, дык і не хапіла абаім месца. Тады мы ўзялі і пайшлі сюды ў Менск шукаць службы. Спачатку было вельмі ц__жка **(5)**, а пасля нічога сабе. Я мыла людзям б__лізну **(6)**, а ён прыстроіўся ў акружным судз__ **(7)**: быў там пры вешалках і кур'ерам. А в__дома **(8)**, у судз__ **(7)**: народу ўсялякага прыходзіць шмат, ды пакуль там хто дойдзе да вышэйшага начальства, пачынаць мусіў спярша ад ніжэйшага. Гэткім ладам недастачы в__лікай **(9)** не цярпелі ды нават хлопца свайго праз усялякія там навукі да чыноўніцтва давялі. Пасля мой памёр, в__чны **(10)** яму пакой, а я засталася адна са сваім Мікіткам. Так што, як бачыце, ніякай далікатнасці нямашака.

Янка Купала, *Тутэйшыя*

## IV. Устаў у сказы адпаведныя па сэнсе фразеалагізмы. Калі трэба, дапасуй фразеалагізмы граматычна. Звярні ўвагу, што фразеалагізмаў для ўстаўкі на два больш (5 пунктаў).

**Фразеалагізмы для ўстаўкі:**-як свае пяць пальцаў, як кот наплакаў, як хваробе кашаль, на вачах, на кароткай назе, на руках насіць, рукі кароткія.

1. Ты мне дапамагаеш ___________________________, адыйдзі, калі ласка, і не замінай.
2. Грошай пасля святаў засталося – ___________________________, хопіць толькі на падарунак для маці.
3. Трагедыя ў нас ___________________________: вежа Наваградскага замка можа абрынуцца ў любы момант.
4. Крытыкаваць чужую працу дык ты можаш – а самому зрабіць – ___________________________.
5. Яго адносіны да яе моцна змяніліся: некалі ён яе ___________________________, а цяпер зусім не звяртае ўвагі.

## V. Пустыя месцы ў тэксце запоўні словамі для ўстаўкі. Звярні ўвагу, што слоў для ўстаўкі на два больш (10 пунктаў).

**словы для ўстаўкі:** марыць, вучыць, трымаюць, апранае, маюць, сімптомамі, хваробай, перашкодамі, абыякавымі, дзеяннем, рызыкоўным, шкоду.

У *Тутэйшых* падагульняецца досвед смутных дзён у гісторыі Беларусі, калі змяняліся ўлады, сцягі, рэжымы, войскі, а менчукі заставаліся ўсе тымі ж, інертнымі і як быццам (1)_________________ да свайго лёсу. Галоўны "тутэйшы", Мікіта Зносак, які (2)_________________ стаць асэсарам пры любой уладзе, (3)_________________ нямецкую мову за нямецкай акупацыяй, (4)_________________ фуражку з белым арлом за палякамі, махае чырвонай анучай падчас наступу Саветаў, спекулюе, прамышляе, падрабляе, хаўрусуе з рознай набрыддзю – і ў выніку ўсе ж прайграе змаганне за дабрабыт і жыццё.
Янка Купала паказвае віну і бяду "тутэйшага", сутнасць якіх – не адчуваць сябе беларусам і не называцца ім. "Тутэйшасць", якая, безумоўна, ёсць сацыяльнай (5)_________________, расшыфроўваецца як сіндром нацыянальнага комплексу імунадэфіцыту, свайго кшталту нацыянальны СНІД. Ён прынёс (6)_________________ Беларусі ў час яе экзістэнцыйнага выбару ў 1920-я, шкодзіць і сёння. Янка Здольнік, Ануля, Спічыні, Наста Пабягунская ды іншыя персанажы трагікамедыі ў той альбо іншай ступені надзеленыя (7)_________________ гэтай хваробы, нягледзячы на сваю станоўчасць альбо адмоўнасць. Сёння гледачы, якія сочаць за (8)_________________ *Тутэйшых* на сцэне Купалаўскага тэатра, (9)_________________ магчымасць параўноўваць яго з рэаліямі сучаснасці. А гэта зрабіла існаванне *Тутэйшых* на сцэне (10)_________________. Варта нагадаць, што да 1980-х гг. п'еса і яе інсэнізацыя былі пад жорсткай цэнзурнай забаронай.

Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына, *Беларуская літаратура і свет*, Мінск 2006, с. 179.

## VI. Перакладзі на польскую мову. (25 пунктаў)

У нейкім прыгожым краі, трошкі бліжэй Сонца і трошкі далей ад Месяца, у краі, багатым залатымі нівамі, празрыстымі рэкамі, сінімі азёрамі ды цёмнымі пушчамі... Словам, у тым краі, дзе мы з табою жывём, стаяла, а можа, і цяпер стаіць, адна хата.

А жыў у гэтай хаце селянін па імені Янка. Здаровы, як зубр, добры і не дужа мудры. Было ў яго пяцьдзесят сыноў, сорак валоў і кошка. Ну, можа, не пяцьдзесят сыноў, а тры, не сорак валоў, а два. Але кошка была, гэта ўжо можаце мне паверыць. Пярэстая. З чатырма лапамі. З адным хвастом.

Араў Янка зямлю, пасвіў каровы і хмары. І жыў бы зусім добра, каб не звалілася на яго бяда.

Было гэта даўно. Так даўно, што на Беларусі тады яшчэ вадзіліся чэрці. І ў кожнага з тых чарцей было сваё месца працы.

Адзін жыў у вадзе, пасвіў шчупакоў, лінёў ды акунёў. Быў зялёны і калматы[1], вельмі падобны на купу твані[2]. Звалі яго Вадзянік.

Другі жыў у лесе, пасвіў аленяў і быў падобны на абраслы мохам пень. Калі сустрэнеш, то і не адрозніш. Звалі яго Лесавік.

Але быў і трэці, што жыў па хатах і пасвіў цвыркуноў[3]. Гэта быў самы шкодны. Рожкі ў яго былі, як у козкі, зубкі, як часначок, хвосцік, як памялцо[4].

І аблюбаваў гэты чорт Янкаву хату. І не тое каб са злосці шкодзіў, а проста быў свавольнік. Толькі ад тых свавольстваў Янку аж плакаць хацелася. Дзіва што! Ты ж таксама не ад злосці сваволіш? Ну вось, а бацькі часам плачуць. Кепска!

Не стала ў хаце ад чорта спакою. Пазаплятае коням грывы так, што пасля не расчэшаш, а думаюць на сыноў. Вяршкі з малака зліжа, а думаюць на бедную кошку. Часам узімку так завые ў коміне, што ў людзей мароз па скуры, і страшна на двор выходзіць. Ці забярэцца ў комін, з'едзе па ім і насыпле ў капусту сажы.

У. Караткевіч, *Чортаў скарб*

---

[1] Калматы – kosmaty, kudłaty, włochaty.
[2] Твань – bagno, trzęsawisko.
[3] Цвыркун – świerszcz.
[4] Памяло – pomiotło, miotła z gałęzi.